Сычова, І.С. **Традыцыйнае выхаванне дзяцей на Палессі** (паводле рамана Івана Мележа “Людзі на балоце”) /І.С.Сычова // Материалы Международной научно-практич. конференции “Этнопедагогика: история и современность”, Мозырь, 17-18 октября 2013 г. / УО МГПУ им. И.П. Шамякина; редкол. : В.С.Болбас (отв. ред.) [и др.]. – Мозырь, 2013. – С. 115–117.

**Сычова І.С.**
УА МДПУ ім. І.П. Шамякіна
г. Мазыр, Рэспубліка Беларусь

## ТРАДЫЦЫЙНАЕ ВЫХАВАННЕ ДЗЯЦЕЙ НА ПАЛЕССІ
(паводле раман Івана Мележа “Людзі на балоце”)

У рамане Івана Мележа “Людзі на балоце” адлюстравана жыццё беларусаў-палешукоў у трыццатых гадах ХХ ст.. Асобныя эпізоды характарызуюць заняткі, інтарэсы і забавы дзяцей; выяўляюць адметнасць іх выхавання, адукацыі і побыту; паказваюць асаблівасці ўдзелу ў народных святах і абрадах.

На першых старонках рамана мы знаёмімся з Валодзькам, братам Васіля Дзятла і Хведзькам, братам Ганны Чарнушкі, якія сябруюць, большасць вольнага часу праводзяць разам. Твор пачынаецца з апісання летняй раніцы, збораў і ад’езду куранёўцаў на сенакос. У гэтым эпізодзе з аднаго боку паказаны асаблівасці арганізацыі жыцця і працы палешукоў, з другога – праз перажыванні хлопчыкаў – першыя радасці і расчараванні дзяцінства.

Валодзька вымушаны застацца з дзедам дома. Маці наказвае яму: *“Ты, сыночак, будзеш з дзедам, хату пасцеражэш. Ды глядзі добранько – усё дабро тут на вашых руках!.. Не дай Бог што-небудзь учыніцца – згалеем зусім!..”* [2, 11]. Аўтар зазначае, што хлопчык *“нічога не хацеў слухацца: ні матчыных добрых слоў, ні дзедавай строгасці, ні братавай пагрозы пугай”* [2, 12]. Ён доўга бег за возам, але пасля апошняга матчынага аргументу, калі не дапамаглі ні ўгаворы, ні пачастункі, – лупцоўкі на вачах у аднавяскоўцаў, – заплаканы і прыніжаны быў вымушаны скарыцца і вярнуцца дадому: “*Паўз малога па дарозе ехалі і ішлі мужыкі, і амаль кожны падсмейваўся з яго бяды: “Што, усыпалі?” Гэта распальвала яго крыўду. Невясёлы, адзінокі і, як мала хто ў свеце, няшчасны, пацёгся ён дамоў, пацёгся цераз бульбоўнік, цераз агароды, толькі б нікога не сустракаць, нікога не бачыць!..”* [2, 13].

Хведька ў той дзень, наадварот, быў шчаслівы, ён паехаў на сенакос разам са сваёй сям’ёй, дапамагаў сястры раскладваць вогнішча, еў печаную бульбу, начаваў каля кастра, пасвіў і даглядаў каня. Можна не сумнявацца, што гэтыя ўражанні адзінства з прыродай, з працоўным побытам сям’і засталіся ў хлопчыка на ўсё жыццё.

Але ў рамане і Хведзьку давялося перажыць падобныя горкія хвіліны. Рыхтуючыся да вяселля, Чарнушкі едуць у Юравічы на кірмаш, а малога, які вельмі хоча пабачыць новыя мясціны, пабываць на кірмашы, пакідаюць на гаспадарцы:

“*– Дак глядзі ж, кеб з хаты нікуды! І ў хату нікога чужога – зачыніся і не пускай! І – барані Бог з вугольчыкамі балувацца!*

*– Не б-буду!.. – Хведзька ледзь стрымліваўся, каб не заплакаць.*

*– Дазнаюся, дабра не чакай! Шкуру спушчу!.. – Мачыха загадала напаследак: – Ідзі ў хату і зачыніся!*

*Хведзька неахвотна, расчаравана падаўся ў сенцы...”* [2, 260].

Такім чынам, аўтар паказвае, што на першым месцы ў традыцыйнай палескай сям'і знаходзяцца не інтарэсы і часовыя жаданні дзяцей, а найперш патрэбы сям'і і гаспадаркі. Сялянскіх дзяцей з малога ўзросту прывучалі падпарадкоўвацца аўтарытэту старэйшых, стрымліваць свае эмоцыі, улічваць жыццёвыя абставіны.

Палескія сем'і былі вялікімі, нярэдкасць пяць і больш дзяцей, што патрабавала строгай іерархіі ўзаемаадносін як паміж пакаленнямі, так і паміж братамі і сёстрамі. У творы Васіль, як старэйшы брат, па-сутнасці, імкнецца замяніць Валодзьку бацьку. Здаецца, што ён не звяртае на брата ўвагі, але гэта не зусім так. Знаходзячыся ў турме, Васіль распытвае ў маці пра брата, праяўляе неабыякавасць. Хутчэй, галоўны герой падпарадкоўваецца традыцыйнаму на Палессі звычаю, які забараняе дарослым прылюдна выказваць пяшчотныя адносіны да дзяцей, патрабуе строгасці і патрабавальнасці: *"Любі дзіця, як душу, а калаці як грушу"* [1, 134]. Галоўны герой з'яўляецца для малодшага брата ўзорам мужчынскіх паводзін. Гэта яскрава праяўляецца пасля бойкі Васіля з Яўхімам, калі Валодзька сустракае брата і выказвае захапленне яго сілай, мужнасцю.

Аўтарытэт старэйшых і ў першую чаргу бацькі для дзяцей быў бясспрэчны, што выяўляецца ў дэталях твора, паводзінах персанажаў: *"Дзеці, дзве Хадосьчыны сястрычкі і брат, сядзелі на печы, то гаманілі аб нечым, то спрачаліся, але як толькі ў спрэчку ўмешваўся знізу грозны бацькаў голас, адразу ўціхалі..."* [2, 80-81]. Дзеці слухаліся бацькоў, называлі іх на "Вы".

Шмат увагі ўдзялялі дзецям іх бабулі і дзядулі, асабліва калі жылі разам. Для Валодзькі, у якога памёр бацька, вельмі блізкім чалавекам з'яўляецца дзед Дзяніс. Дзед, заўзяты рыбак і майстар вырабляць мясцовыя рыбалавецкія прылады ("*лазовыя баўтухі, лазовыя таптухі, венцеры, сплеценыя з* канапляных *нітак кломлі*") перадае свае ўменні ўнукам, з асаблівым клопатам адносячыся да малодшага: *"У Васіля была і таптуха, і кломля – усё дзедавага вырабу – снасць, чужым вачам проста-такі зайздросная. За лета Дзятлы, можа, разоў дваццаць выпраўляліся з двара з усёй гэтай зброяй. Ішлі ў поўным складзе – не толькі матка, Васіль і дзед Дзяніс, але і Валодзька. Памочнік з малога такі, што, каб сядзеў ён дома, лепш было б, але паспрабуй утрымаць дома гэту неадчэпу-заразу. Цягнеш яго па дрыгве, цераз чорныя брады, цераз канавы.*

*Дзед, у чорна-рудых штанах, якім было, можа, з паўсотні гадоў, сам выбіраў Васілю з маткаю рыбную мясцінку, але за гэтым адразу ж адасабліваўся. Трымаючы Валодзьку за руку, з таптухай ён знікаў у зарасніках і вяртаўся толькі тады, калі трэба было ісці дадому. Усяляк і яму лавілася, і ўсё ж не раз было так, што са сваёй таптухай ён прыносіў торбу, паўнейшую і важчэйшую, чым тая, што вісела на Васілёвых плячах. Валодзька, стомлены, чорны ад твані, аж ззяў ад шчасця*" [2, 37-38].

Нават Міканор, змагар з мясцовым бытавымі і рэлігійнымі звычаямі і забабонамі, з замілаваннем успамінае свайго дзеда: *"Дзед Амялян, які памёр перад самай Міканоравай службай, ідучы з гумна! Дзед, які столькі ведаў казак, з якім столькі вечароў грэліся, калі Міканор малы быў, на чаране. Дзед, які зрабіў яму калісьці санкі, пра якога столькі добрага помнілася*!.." [2, 176]. Такім чынам, дзяцей у палескіх сям'ях любілі, па-свойму песцілі, імкнуліся аддаць лепшае. Любоў гэта часцей выўлялася не столькі ў словах, колькі ва ўчынках, незаўважных на першы погляд нюансах узаемаадносін паміж блізкімі людзьмі.

Народная педагогіка вылучаецца прыродаадпаведнасцю, што шырока прадстаўлена ў рамане. Дзеці і гадаваліся ў адзінстве з прыродай, і працавалі (збор грыбоў, ягад, арэхаў, рыбная лоўля), і забаўляліся на ўлонні прыроды. У лесе дзеці былі незаменнымі памочнікамі, і адначасова незаўважна для сябе пераймалі неабходныя жыхару Палесся ўменні і навыкі, вывучалі родную прыроду: *"Спелі ягады. За суніцамі*

*– чарніцы, ад якіх аж чорна было між рослага папаратніку. Нядоўга было чакаць і малін, што густа спелі ў гадзючых зарасніках. Малеча і старыя, каго не бралі рабіць на сенажаць ці ў поле, з дня ў дзень снавалі па лесе з лазовымі каробкамі і кошыкамі. Кожны зручны момант хапаліся з лугу, з поля ў лес і жанкі і мужчыны, працаўнікі – у лесе цяпер была важная праца. Ягады былі не якія там прысмакі, як у другіх, – у Куранях ягадамі карміліся, ягады збіралі, сушылі на продаж, на грошы, на чорны зімовы ці веснавы дзень. Лес быў памочнік полю, скупой, ненадзейнай зямлі"* [2, 37].

Сваю прагу да небяспечных прыгод і вострых уражанняў хлопчыкі з невялікай вёскі Курані задавольваюць даволі нечакана для сучаснага чытача, нягледзячы на забароны і запалохванні старэйшых яны ходзяць у гадзючнік: "*Узболатак і балота – не якія-небудзь далёкія, а зараснікі алешніку і лазы, можа, за сто крокаў ад Ганнінага агарода – кішэлі гадаўём. Малыя, як бы іх цягнуў хто, як на забаву, стараючыся не паказваць адно аднаму, што сэрца трымціць ад страху, лазілі ў зараснікі, цікавалі, як варушацца ў гушчыні кустоў слізкія клубкі. Забавы не часта канчаліся адным цікаваннем: куды больш было радасці, хвалячыся адвагаю, прыціснуць гадзюку дручком, зашчаміць яе, што грозна сычыць, у распірку і вынесці на выган. На выгане агулам учынялі расправу. Тут было завяршэнне відовішча: глядзелі, як доўга круціцца без галавы гадзючы хвост..."* [2, 36].

Вужы, наадварот, жылі побач з людзьмі на балоце і карысталіся асаблівай прыхільнасцю палешукоў*: "Матка казала Васілю, што ў суседа Дамеціка вуж, які ўжыўся ў хляве, ссе карову, але Дамецікавы не гналі яго. Васіль не здзіўляўся гэтаму: як і ўсе ў Куранях, лічыў ён вужа добрай істотай, крыўдзіць якую – грэх... "* [2, 36].

Вясковыя дзеці з малых год засвойвалі рэгіянальны светапогляд, які мае выток у дахрысціянскіх вераваннях беларусаў-палешукоў. Разам з тым яны раслі асцярожнымі, назіральнымі, чаго патрабавала жыццё ў акружэнні непраходных палескіх балот. Так з рамана даведваемся, што брат Міканора, Мотрык утапіўся, калі пасціў каня на ўзболатку, захацеў пакупацца і нырнуў у балотнае азярцо [2, 177].

Суровая прырода, антысанітарыя, адсутнасць медыцынскай дапамогі прыводзілі да хвароб і нават смерці дзяцей, асабліва ў раннім узросце: *"А бацька называў ужо імёны нябожчыкаў дзяцей сваіх, Міканоравых братоў і сясцёр – памінаў Ілюшу, Маню, Матруну, Петрыка, Мотрыка. Ілюшу і Маню Міканор не бачыў ніколі, а Матруна ж і Петрык на вачах яго задушыліся ад гарлавой; ледзь не ў адзін дзень памерлі. Ён помніць, Петрык задыхнуўся, калі Матрунку яшчэ не занеслі на могілкі, калі яшчэ ляжала ў труне. Іх павезлі разам, палажылі ў адну яму..."* [2, 176-177].

Побытавыя ўмовы сям'і і гігіенічныя патрабаванні ў Куранях далёкія ад ідэальных: куранёўцы трымаюць парасят у сенцах, кормяць іх у хаце; вокны не адчыняюцца, хата не праветрываецца. Гэта асабліва кідаецца ў вочы Міканору, які адслужыў у Мазыры ў арміі, прывык да парадку. Малады чалавек занепакоены антысанітарыяй, адсутнасцю побытавай культуры, але зрабіць з гэтым нічога не можа: *"Нядаўна заходзіў да Зайчыка – дык парасяты ў хаце, можна сказаць, побач з* дзецьмі. *Дзеці лазяць, гуляюць каля іх, між іх, у разлітай парасячай паліўцы, а Зайчыкам – хоць бы што, як бы так і трэба. Калі сказаў ім, дык Зайчык пажартаваў, што невядома каго яшчэ даглядаць лепей трэба! Дзяцей, маўляў, вунь колькі, а парасят – двое! Зайчыха на яго, Міканора, як на дзівака пазірала!"* [2, 163]

Прывык былы салдат і да наведвання лазні, але будаваць лазні не прынята ў Куранях, ды і не толькі ў гэтай вёсцы*: "Летам – то любая сажалка, копанка* кожная *прыняць можа, а зімой – як? Калі меншы быў – маці ў начоўкі, у цэбар саджала, а цяпер – вельмі ты вымыешся ў начоўках! І сесці толкам няма дзе ў іх, не тое што ў цэбары!"* [2, 163]. І археалагічныя дадзеныя, і сведчынні этнографаў, і расказы мясцовых жыхароў пацвярджаюць адсутнасць лазняў на Палессі.

Вачыма дзяцей, з гумарам і замілаваннем сталага чалавека апавядае аўтар аб асаблівасцях побыту, правіл паводзін за сталом і арганізацыі харчавання палешукоў. У творы апісана традыцыйная вячэра ў сям'і Чарнушкаў, якая адбываецца ўрачыста, пры святле лучыны, за сталом пад абразамі: *"Самы малодшы Хведзька сядзеў неспакойна, еў хапаючыся, усё выцягваў шыю, стараўся зазірнуць, што там у місцы, ці няможна падчапіць грыбка, – але, навучаны немалым вопытам, тут жа спасцярожліва паглядваў на маці і пад яе строгім позіркам прыціхаў"* [2, 79]. Галоўнай стравай на стале з'яўляецца традыцыйны грыбны баршч, на гэты раз безнадзейна сапсаваны прусаком, што ўваліўся ў страву. На гэтым заснаваны камізм сітуацыі, што дэманструе аптымізм і дасціпнасць палешукоў: *– То-та я гляджу – боршч сягоння смачны, – паспрабаваў бацька перавесці гаворку на жарт. – Як бы з салам!* [2, с.79].

У рамане паказана, што больш разнастайнай ежа палешукоў была ў святы, асабліва на Каляды, на Вялікдзень, у час вяселля. Для дзяцей гатавалі спецыяльныя дзіцячыя стравы, часцей з малаком. Каб задобрыць Валодзьку, які не хоча заставацца дома, маці частуе хлопчыка аладкамі з салам і яшчэ наказвае: "*– Я* табе *кулеш у чыгунку ў печцы паставіла. Смачны, з малаком... А ў прыпечку яечко вазьмі!.. Можаш узяць!"* [2, 12].

Пры наведванні сваякоў дзецям абавязкова прыносілі гасцінцы, пачастункі*: "Цёткі дома не было. Паехала з дзядзькам на луг. У хаце толькі дзеці гулялі. Хадоська выняла з хусткі гасцінчык, дала кожнаму па сушанай грушцы, спраўдзіла матчыну волю – паклала на стол нізку грыбоў. Пагаварыўшы, сама не помніла, аб чым, пагладзіла галоўку меншаму і стала збірацца зноў у дарогу*" [2, 355]. Паводле мясцовых звычаяў, ісці з пустымі рукамі ў хату, дзе ёсць дзеці, непрыстойна, асабліва ў свята. Гэты звычай захоўваецца і ў наш час, але традыцыйныя прысмакі (арэхі, боб, гарох, зернета, пернікі, перапечкі, яйкі) страчваюць папулярнасць.

Адной з форм узаемаадносін паміж дзецьмі і іх роднымі было гасцяванне, старадаўні мясцовы звычай, масавы збор гасцей з мэтай адзначэння пэўнага сямейнага або каляндарнага свята. У рамане апісваецца як на Коляды да бацькоў Міканора збіраюцца госці, замужнія дочкі з сем'ямі, што па традыцыі выходзяць замуж і жывуць асобна: *"На другі дзень ледзь не з самага ранку хата гаманіла гасцямі. Першыя прыбылі на санях – Вольга са сваім чалавекам, з цэлай чарадою адзетых у світкі, абкручаных, перавязаных хусткамі, змерзлых, дзікаватых дзяцей. Прывезла і самае дробнае, паклала на палаці"* [2, 182-183].

Праўдзіва перадаючы мастацкімі сродкамі адметнасць нацыянальнага характару, Іван Мележ адлюстраваў адметную рысу вясковых дзяцей – сарамлівасць, недаверлівасць да малазнаёмых: *"Малыя госці, без світ, без хустак, адны – бялявыя, кірпатыя, у матку, другія – з чорнымі неслухмянымі хібамі, як дзікія кабаняты, аблічам на бацьку – спачатку ў чужой хаце, перад чужым дзядзькам ніякавелі,* цiснуліся *адно да аднаго ды азіраліся. Нібы ў палоне былі. Міканор пасарамаціў іх за нясмеласць, сказаў, што хлопцам гэта ды асабліва пагана, але ад жартаў яго ўсе надзьмуліся яшчэ больш"* [2, 182-183]. Але дзеці – ёсць дзеці, хутка яны *"расходзілася так, што скакалі і на печы, і на палацях, і пад палацямі лазілі. Міканору ўжо стрымліваць іх давялося, адабраць шынель, які сталі валачыць па падлозе.*" [2, 183].

Сарамлівыя, але кемлівыя і цікаўныя вясковыя дзеці – актыўныя ўдзельнікі традыцыйных народных святаў. Хведзьку, малодшаму брату Ганны Чарнушкі, адведзена важная роля брата нявесты на палескім вяселлі: *"Як толькі выпіла чарку гарэлкі Ганніна дружка Маруся, мачыха выштурхнула наперад к сталам разгубленага, напалоханага Хведзьку, які, апынуўшыся перад людскімі позіркамі, стаў дзікавата азірацца – яўна хацеў шмыгануць у сенцы. Столькі казала, вучыла маці, што трэба рабіць, як прыйдзе яго пара, а выйшаў – ураз забыў усё.*

*– Хадзі ка мне! – пазвала яго Ганна. – Вазьмі за руку.*

*– Ідзі, ідзі! Не бойся, браток! – падскочыла да Хведзькі Сарока. – Вядзі к сталу маладога, кеб – даў залатога!*

*Хведзька азірнуўся на сенцы, падумаў трохі, неахвотна паслухаўся, узяў руку, якую падала Ганна. Глянуў, куды ж весці?*

*– Туды, да сватоў! – шапнула брацiку Ганна, пайшла к Пракопу і Сароцы, якая ўжо важна сядзела за сталом.*

*– Скажы, кеб заплацілі за маладую! – не ўтрывала, памагла маці.*

*Хведзька выціснуў:*

*– Заплаціце... за маладую...* [2, 373-374].

У гэтым эпізодзе аўтарам паказаны псіхалагічныя перажыванні дзяцей, адлюстраваны даўні, паводле даследаванняў з часоў матрыярхату, мясцовы вясельны звычай выкупу нявесты маладым, дзе важная роля адводзіцца брату маладой, як прадстаўніку яе роду [3, 119-120].

Вясковыя дзеці з нецярпеннем чакаюць Каляд, што з’яўляюцца адным з самых багатых на традыцыі зімовых каляндарных святаў на Палессі. У песнях-шчадроўках маленькія артысты жадаюць бацькам Міканора добрага ўраджаю, будучага вяселля сына. З тэксту відаць, што і дзеці, і бацькі рыхтаваліся да калядавання: развучвалі шчадроўкі, ведалі аб турботах кожнай сям’і:

У творы перададзена непаўторная атмасфера свята, названы традыцыйныя калядныя пачастункі, адзначаецца рознаўзроставы склад удзельнікаў: *“Расчуленая маці, не апранаючыся, вынесла раннім спевакам добры кавалак каўбасы, акраец свежага хлеба. Але не ўправілася яна вярнуцца, не паспелі Зайчыкавы, мабыць, выйсці на вуліцу, як пад вокнамі зноў запішчалі: на гэты раз ужо суседскі малы – Валодзька з Чарнушкавым Хведзькам, – запішчалі няцвёрда, баязліва, з няпэўнай надзеяй, мусіць, першы раз у жыцці! Яны хутка збіліся, збянтэжыліся зусім і змоўклі дачасна”* [2, 180-181].

Апісваючы палескую вёску 30-ых гадоў XX стагоддзя пісьменнік зафіксаваў у жывым бытаванні мясцовыя калядныя традыцыі, што з’яўляліся эфектыўнай формай арганізацыі народнага выхавання. У рамане паказана, што Каляд у невялікай палескай вёсцы Курані чакалі, да іх рыхтаваліся і старыя, і малыя. Дадзеная форма народнага выхавання не з’яўлялася стыхійнай, а была, па-першае, зададзена цыклам каляндарных абрадаў, а па-другое, спецыяльна арганізаванай, што дазваляла паступова далучаць да яе самых маленькіх удзельнікаў. Звычай адраджаецца, але без належнай падрыхтоўкі, без ведання народных традыцый страчваецца яго спрадвечны змест і сэнс.

Іван Мележ праўдзіва, без прыкрас паказаў і сапраўднае становішча школьнага навучання дзяцей на Палессі. З твора мы даведваемся, што з Куранёў у школу ходзяць толькі двое – Дзяцел Соня і Глушак Сцяпан. Прычыны раскрываюцца на вясковым сходзе: малым няма як дабірацца па бездарожжы, няма чаго надзець і ў што абуцца, трэба дапамагаць па гаспадарцы бацькам і глядзець малодшых братоў і сясцёр. Такім чынам, у мінулым школа не з’яўлялася галоўнай для дзяцей, вучыліся яны больш у жыцця, у старэйшых, у роднай прыроды.

У рамане Івана Мележа “Людзі на балоце” мастацкімі сродкамі адлюстраваны традыцыі выхавання дзяцей на Палессі, што аўтар перажыў і назіраў асабіста, як ураджэнец Хойніцкага раёна, як будучы творца. Пісьменнік не падзяляе іх на станоўчыя і адмоўныя, мэтазгодныя і немэтазгодныя, а паказвае комплексна, у адзінстве з духоўнай і матэрыяльнай культурай, непаўторнай гаворкай, працай і побытам беларусаў-палешукоў таго часу, тым самым захоўваючы цэласнасць, этнічную і рэгіянальную адметнасць, прыродазгоднасць і мэтазгоднасць народнага выхавання.

**Літаратура**

1. Касько, У.К. Палескі дзівасіл : бел. нар. прыказкі, прымаўкі, выслоўі : са скарбніцы А. К. Сержпутоўскага / У.К. Касько. – Мінск : Выш. шк., 2005. – 383 с.

2. Мележ, І. Збор твораў у 10 тамах. Том 5. Людзі на балоце: раман з “Палескай хронікі” /І.Мележ. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1981. – 415 с.

3. Этнаграфія Беларусі: энцыкл. / рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 575 с.